# ЛІТАРАТУРНАЯ ВЫСТАЎКА „ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА“

У выставачнай зале дзяржаўнай бібліятэкі імені В. І. Леніна арганізавана літаратурная выстаўка «Вялікая Айчынная вайна». На выстаўцы прадстаўлены некалькі тысяч кніг гістарычных, літаратурных, даведачных, многа ілюстрацый, фотадакументаў, плакатаў і лозунгаў.

Першы раздзел выстаўкі прысвечан гераічнаму мінуламу рускага народа. Тут сабрана літаратура аб вялікіх палкаводцах нашай Радзімы—Неўскім, Пажарскім, Мініне, Сувораве, Кутузаве, Баграціёне, Ушакове, Нахімаве і другіх.

Вельмі цікавы раздзел «Чырвоная Армія ў вялікай Айчыннай вайне». Тут многа літаратуры аб усіх родах нашых войск—пяхоце, конніцы, артылерыі, авіяцыі, танках, ваенна-марскім флоце і г. д. Шматлікай дакументальнай і мастацкай літаратурай паказан гераічны шлях барацьбы Чырвонай Арміі з нямецкімі захопнікамі. На пяці стэндах змешчаны ілюстрацыі і кнігі аб Героях Савецкага Саюза. Асобна сабрана літаратура аб слаўных сынах беларускага народа—Героях Савецкага Саюза—Гастэла, Даватары, Палаўчэні і другіх.

Асобны стэнд займае раздзел гарады-героі, на якім паказана гераічная абарона Ленінграда, Сталінграда, Масквы, Севастопаля і Одэсы.

На выстаўцы шырока адлюстраван партызанскі рух у Беларусі.